# ДАЙДЖЭСТ

## АСВЯТЛЕННЕ ЛГБТ-ТЭМАТЫКІ Ў БЕЛАРУСКІХ МЕДЫЯХ

**Аўтар: GPress.info**

**IV квартал 2021 года**

У чацвёртым квартале 2021 года працягнуўся распачаты трэнд сярод дзяржаўнай прапаганды са спробамі дыскрэдытавання ЛГБТК+ - супольнасці.

"Пакаянныя" відэа, якія сілавікі ўзялі на ўзбраенне практычна з пачатку пратэстаў, сталіся яшчэ адным спосабам уздзеяння на ЛГБТ-людзей Беларусі. Некалькіх затрыманых прымушалі паведаміць пра сваю сексуальную арыентацыю, што разам з агучваннем памераў іх заробкаў (вышэйшых за сярэднія па краіне) па задуме замоўцаў павінна было распальваць нянавісць да такіх людзей.

Аднак медыі рэагавалі нетрывіяльна. Яны тлумачаць аўдыторыі, што насамрэч адбываецца і чаму нельга патрапляць у такую відавочную пастку нянавісці.

Белорусские силовики пришли за геями

Шантаж и реальная угроза жизни. Аутинг как способ борьбы с "неугодными"

Ориентация - белорус. Как реагировать на принудительный аутинг?

Как государственная пропаганда дискредитирует задержанных

«Извинения на камеру стали снимать в другом стиле»: Что нового изобрели силовики для покаянных видео

Пасля «пакаянных» відэа з аўтынгам у сацыяльных сетках пачалася цэлая кампанія падтрымкі ЛГБТ-супольнасці.

Вядома, шмат хто з прадстаўнікоў супольнасці быў вымушаны пакінуць Беларусь з-за пагрозы бяспецы.

«Открытый гей объясняет, чего ему стоил последний год и как ГУБОПиК усиливает ЛГБТ-сообщество Беларуси»

Іншыя паведамленні прапаганды застаюцца ў духу канспіралагічных тэорыяў аб тым, што ЛГБТК-рух – гэта спроба скараціць насельніцтва планеты або справакаваць канфлікт.

Хаця, відавочна, што канфлікт спрабуюць раздзьмуць самі прапагандысты. На шчасце, беспаспяхова.

Рэдакцыя Gpress.info

P.S. 2021 год стаўся знакавым для Gpress.info. Наша аўдыторыя на сайце і ў сацыяльных сетках дасягнула адзнакі ў 100 000 асобаў штомесяц!




**Дзяржтэлеканалы падвялі вынікі года. Еўропа трашчыць па швах, беларуская эканоміка на вышыні, новая Канстытуцыя зараджаецца**

Большасць перадач падвялі вынікі года, а значыцца было шмат Аляксандра Лукашэнкі, нечакана з’явіліся і іншыя чыноўнікі. СТВ, «Беларусь-1» и АНТ 25 и 26 снежня хваліліся дасягненнямі, перамагалі санкцыі, рыхтаваліся да рэферэндума і жахаліся ЛГБТ-лобі ў Еўропе.



**«Улады хочуць, каб арыштаваны не меў шанцаў на абарону». Гамафобія ў Беларусі сталася прыладай рэпрэсіяў**

Як гамафобія ўладаў з асабістай праблемы сталася яшчэ і прыладай рэпрэсіяў, і чаму “пакаянныя” відэа з прызнаннем гомасексуальнасці наўрад ці змогуць перамагчы гамафобію грамадства – пра гэта Reform.by пагутарыў з вядомым ЛГБТ-актывістам Мікалаем Анціпавым.



**Бацькі папрасілі пажыць асобна. Як жывецца ЛГБТ-дзяўчыне ў Магілёве – шчырае інтэрв’ю.**

Сёння гераіняй нашага інтэрв’ю сталася магілеўчанка, якая з самага дзяцінства ведала, што яна любіць жанчын.

.



## Аляксей Талай пра прапаганду ЛГБТ: «Прадстаўнікі гэтай супольнасці намагаюцца данесці сваю пазіцыю ажно да моладзі, ажно да дзяцей малодшых класаў, ажно да дзіцячых садкоў»

Паралімпіец Аляксей Талай падзяліўся меркаваннем пра беларускія традыцыйныя каштоўнасці.



## Сярод тых, хто ўцякае з Ірака ў Беларусь, - геі, якім на радзіме пагражае смерць

Большасць мігрантаў, якія спрабуюць патраапісь праз Беларусь у Еўразвяз, - іракскія курды. Багата з іх едзе ў пошуках лепшага жыцця і працы, часцяком – разам з сем'ямі. Але некаторыя літаральна збягаюць ад смерці.



## «Ліберальныя каштоўнасці прывядуць грамадства да канфлікту, а потым да вымірання?

«Калі трэнд на "новыя каштоўнасці" аб талерантнасці да ЛГБТ, аднаполых шлюбаў і праве выбіраць пол будзе працягвацца, гэта пагражае нецярпімасцю ў грамадстве, вострым канфліктам і скарачэннем насельніцтва ў аддаленай перспектыве», - меркаванне аналітыка Вячаслава Сутырына.



**«Насельніцтва планеты хочуць скараціць? Палітолаг пра жудасны план сусветных элітаў»**

«Заходнія ліберальныя каштоўнасці, талерантнасць да нетрадыцыйных сямейных звязаў, ідэя “зялёнай энергетыкі” хаваюць рэальны план элітаў па “ўтылізацыі” насельніцтва планеты», - лічыць расейскі палітолаг Сяргей Міхееў і разважае, каму і навошта гэта патрэбна.



**Настойваючы на сваім: чаму пачаўся і чым можа скончыцца канфлікт Польшчы і Еўразвязу?**

Еўрапейскія ўлады ўжо пачалі даволі паспяхова прымяняць гэта на нізавым ўзроўні – пазбаўляючы сродкаў Еўразвязу праекты ў польскіх рэгіёнах, якія прынялі рэзалюцыі пра “зоны, вольныя ад ЛГБТ”.



**«Не трэба прапаганды, не трэба нам навязваць усё гэта”. Алег Гайдукевіч шчыра пра сямейныя каштоўнасці**

«У студыі праграмы “Постскрыптум” Алег Гайдукевіч, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. Сёння будзем гаварыць пра важную тэму – пра нашы традыцыйныя сямейныя каштоўнасці, якія актыўна імкнуцца размыць.»



## «Яны ўзяліся за нашых дзяцей, навучаючы іх у TikTok свабодным норавам». Алёна Радоўская пра сямейныя каштоўнасці беларусаў

«Вось у Шатландыі пачаліся ЛГБТ-урокі. А вось што задаюць амерыканскім дзецям на школьныя вакацыі. Тэматыка 95 % спісу: Black Lives Matter, ЛГБТ, мігранты...»




## Секс-кампрамат, апраўданні за арыентацыю і фотаздымкі секс-цацак. Як дзяржаўная прапаганда дыскрэдытуе затрыманых

Фотаздымкі секс-цацак улетку 2021 года з’яўляліся ў “зліўных” Telegram-каналах пасля вобшукаў у актывістаў і журналістаў. **Актывіста і блогера намагаліся прынізіць** пры дапамозе відэа з аднаполым сексам. Затрыманы на відэа з «раскайваннем» распавядаў пра аднаполыя сувязі.




## Невядомыя ўзламалі тэлеграм-канал Gender_gap; адна з аўтарак канала затрыманая

У пасце ГУБАЗ называе Мартуль “адной са стваральніц ЛГБТ-праекта “Гендарны прабел”, дзе прапагандаваліся “нетрадыцыйныя каштоўнасці”, рэкламаваліся вычварэнствы, навязваліся меркаванні, чужасныя беларускаму народу».



**«Пагружэнне лішніх людзей у мегасусвет надае магчымасць вырашэння шэрагу ключавых сацыяльных і эканамічных задачаў. Каму гэта выгодна?»**

«На хвалі гэтак званага заходняга псеўдагуманізму пачатку XXI стагоддзя вышэйапісаныя жорсткія метады памяншэння народанасельніцтва сталіся актыўна замяняцца на больш лёгкія прылады: папулярызацыя спаронаў і мадэляў сям’і 2+1, 1+1 (двое бацькоў і адно дзіця, сем’і без дзяцей), прапаганда руху – ЛГБТ, фемінізму і нарцысізму.»



**«Чаму дзяцей забіваюць? Гульні, фуры, чайлдфры: што яшчэ пазбаўляе нас дзяцей?»**

«Яшчэ адным шкодным рухам адмыслоўцы лічаць ЛГБТ, якая ў апошні час усяляк адкрыта і латэнтна спрабуе прапагандаваць свае каштоўнасці сярод моладзі, а таксама дзяцей.
Сёння нават выносяцца на абмеркаванне прапановы прыраўняць ЛГБТ-рух да тэрарыстычнага, бо шкоднасць наступстваў і ўзровень іх небяспекі для грамадства практычна супастаўляльныя.»




**«Што будзе з Еўропай і ці доўга яшчэ пратрывае Еўразвяз?»**

«Брусель адлучае Будапешт ад атрымання грошай з фонду аднаўлення і ўстойлівасці – а гэта 7 мільярдаў еўра на барацьбу з пандэміяй.
Прычына – закон супраць прапаганды ЛГБТ і падтрымка польскага тэзісу “нацыянальнае заканадаўства вышэй за агульнаеўрапейскае”. У дадатак Віктар Орбан падпісаў выгодны газавы кантракт з Расіяй. Здагадайцеся, што пачалося. Прэм’ера назвалі пуцінскім дыверсантам у Еўразвязе.»



## Гедыч: «Удасканальванне Асноўнага Закона краіны – гэта шлях па ўзыходзячай траекторыі да адзінства нацыі»

«Альбо іхныя [апазіцыі] ідэі пра падтрымку ЛГБТ-супольнасцяў. У нашай краіне гэтага ніколі не будзе, таму што нашы падваліны базуюцца на класічнай мадэлі саюзу мужчыны і жанчыны.»



## «Асцярожна, сарказм! Як кітайскія геі галёкнуцца геям Прыбалтыкі»

«Санкцыі, энергакрызіс, "Белавія", каронавірус… Вы нічога не заўважылі? Мы абсалютна перасталі казаць пра геяў. А між тым яны ж таксама людзі. Дзесьці, у нечым…

Так, сярод металургаў і механізатараў іх няма. Але ў шоў трансве… Прабачце, бізнэсе яны ж ёсць!»



## «Палярнасць поглядаў на парушэнні палавой дыферынцыроўкі»

«Акрамя таго, з'явіліся групы падтрымкі – арганізацыі, якія складаюцца з юрыстаў, ЛГБТ- і інтэрсекс-актывістаў, былых пацыентаў. Асноўнай іх ідэяй было забараніць "непатрэбнае" (на іх думку) хірургічнае лячэнне дзяцей з парушэннем палавога развіцця, якое ажыццяўляецца без іх згоды. То бок яны прапаноўвалі ўвесці мараторый на генітальную хірургію да ўзросту, пры якім самі пацыенты здолеюць вызначыць сваю палавую прыналежнасць і даць згоду на аперацыю.»



**«У сферы асаблівай увагі: бяспека дарослых і дзяцей, праца на будучы ўраджай, стратэгія і тактыка вакцынацыі»**

«Адзін з такіх выклікаў – дакучлівая прапаганда не ўласцівых нашаму грамадству поглядаў і арыенціраў, у прыватнасці, тых, якія на Захадзе некалькі дзесяцігоддзяў таму называлі "сексуальнай рэвалюцыяй", а цяпер – «абаронай лгбт-каштоўнасцяў».



**«Суворыя пакаранні для апанентаў улады, замена расстрэлу на пажыццёвае. Распавядаем пра самыя рэзанансныя прысуды 2021 года ў Беларусі»**

«Гэтыя ЛГБТ-рухі, гэтыя аднаполыя шлюбы, гэта педафілія», — характарызаваў становішча пасля выбараў у Беларусі Каўрыгін.




**Якім быў секс у савецкай Беларусі і як да гэтай тэмы ставіліся камуністы? Аповед гісторыка на далікатную тэму**

**Як у тыя часы ставіліся да прадстаўнікоў супольнасці ЛГБТ?**

«Яны, безумоўна, былі, але іх стараліся не агаворваць. Усё гэта адбывалася патаемна. Калі гаворка ішла пра вымушаныя стасункі ў мужчынскім ці жаночым калектыве, то гэта была адна справа. А калі была дэкларацыя падобных адносін, то ў савецкім грамадстве нават у 1920-я падобнае не ўхвалялася. І гэта не мела той падтрымкі, якую мелі свабодныя адносіны паміж жанчынай і мужчынай. Хаця было некалькі даволі цікавых выпадкаў.»



## Сеньёра звольнілі з EPAM за гамафобныя каментары ў LinkedIn

«У LinkedIn скандал, які каштаваў завадатару пасады. Адзін распрацоўшчык пажартаваў: пакуль ён не знайшоў мужа-праграміста, каб не працаваць на вуліцы, ён пакідае рэкруцёрам свае кантакты. У каментары прыйшоў сістэмны адміністратар з EPAM Мікіта Пастухоў – і рэзка выказаўся пра гомасексуалаў (зарааз гэтыя каментары ўжо выдаленыя). Кампанія не засталася ў баку.»




## «Кнігу і інтэрнэт-партал пра злачынствы Польшчы і Літвы супраць уцекачоў прэзентаваны ў Мінску»

*«Калі б у мяжы стаялі геі або нашы бэчэбэшныя здраднікі, Еўразвяз б, напэўна, адкрыў дзверы. А да гэтых няшчасных людзей, уцекачоў, яны ставяцца па-зверску.»*



## Юлія Арцюх: «Не дарма падзеі 2020 года шмат хто характарызуе як пратэст тых, хто зажраўся»

«Вось і выгадавалі, толькі сваіх дзяцей – з цвёрдым разуменнем, што там, за бугром, добра, што Амерыка і Еўропа – гэта цымус, што амерыкансае войска – гэта моц, і што ўсе канфлікты, якія яна развязала па ўсім свеце, - гэта дзеля дабра. Што юрлівасць і распуста – гэта талерантнасць, што геі і лесбійкі – гэта правы чалавека. З найноўшага: усё расейкае – зло.»

У IV квартале 2021 года рэдакцыя Gpress.info падрыхтавала серыю відэаінтэрв’ю з людзямі ЛГБТК+ з Беларусі, якія жывуць за межамі краіны. Яны распавялі пра сваё стаўленне да сітуацыі:

**Квір-асоба, якая пераехала з Беларусі ў Кіеў, пра свой гомасексуальны досвед**

**Небінарны трансмаскулінны чалавек пра каханне да дзяўчын і пра асэнсаванне сябе**

**Інтэрсекс небінарная полісексуальная персона і зорка TikTok пра сваю сексуальнасць**

**Гей-паэт і квір-перформер: “Закаханасць у дзяўчын проста знікла”**

**Бісексуал = звычайны адкрыты чалавек**

**Лесбійка? Бісексуал? Пансексуальнасць – гэта маё!**

**Небінарны пансексуальны чалавек: “Можаш апрануць спадніцу і паводзіць сябе мужна”**

**Пансексуалка і бісексуалка: «Для мяне любая асоба цудоўная, і я магу яе пакахаць»**

**Ад гамафоба да прыняцця сябе як жанчыны**

Таксама на нашым YouTube-канале – шэраг адукацыйных відэа і агляды тэматычных фільмаў

**Раім звярнуць увагу на цыкл аўтарскіх ЛГБТК+ матэрыялаў:**

1. **Серыя матэрыялаў па Адэса Прайд**

   **Фотарэпартаж! Адэса Прайд 2021**
   **Паліцыя і Адэса Прайд: выбухі, правакацыі, пагрозы. Эксклюзіўны фотарэпартаж**
   **Адэса Прайд 2021. Эксклюзіўны відэарэпартаж**

2. **Удзельніца ЛГБТК-калоны на пратэстах у Мінску пра свой шлях і пра бісексуальнасць**

3. **Мой лепшы сябра – гей. Пра гэта я даведалася праз 10 год**

4. **Інфаграфіка! 19 тыпаў сексуальнасці. Ад асексуала да лічбасексуала**

5. **На апошнім дыханні. Лав-сторы беларускі, якая памяняла хлопцаў на дзяўчыну**

6. **«Жыццё змянілася да лепшага» — беларус жыве з ВІЧ 8 год**

7. **Гендар і патрыярхат. Што кажа прапаганда кансерватыўных «каштоўнасцяў»**

8. **«Мяне прымусілі рэзаць нагу нажом, а потым разбітай бутэлькай». Небінарная трансмускулінная асоба**

9. **«У нас больш нармалёвая сям'я, чым у гетэрасексуалаў», – гей, які ажаніўся на лесбійцы**

10. **«Контрпрапаганда». Як у свеце супрацьстаяць гендарнай асвеце**

**Мы ў сацыяльных сетках**

**YouTube**

**TikTok**

**Telegram**

**Facebook**

**Instagram**

**ВКонтакте**

**Яндекс.Дзен**

**Twitter**

**E-mail: GayPresseu@gmail.com**

GPress.info

GPress.info